# Гістарыяграфія праблемы фарміравання сістэмы вышэйшай школы БССР (1921–1939 гг.)

**Г. У. Шастак,**
аспірант РІВШ

*Абвяшчэнне беларускай дзяржаўнасці пасля прыходу савецкай улады стварыла ўмовы для заснавання вышэйшай школы з мэтай падрыхтоўкі новай інтэлігенцыі. На працягу 1920–1930-х гг. у БССР адбываўся працэс стварэння сістэмы ВНУ, што была зарыентавана на падрыхтоўку спецыялістаў, у якіх мела патрэбы рэспубліка.*

*Гісторыя вышэйшай адукацыі рэспублікі стала аб'ектам даследавання з другой паловы XX ст. У гістарыяграфіі гісторыі вышэйшай школы БССР выдзяляюцца два этапы: савецкі і постсавецкі, альбо сучасны. Савецкая гістарыяграфія прадстаўлена даследаваннямі па гісторыі сістэмы вышэйшай адукацыі СССР, складовай часткай якой з'яўлялася вышэйшая школа БССР, а таксама даследаваннямі, у якіх асветлены старонкі гісторыі вышэйшай школы БССР. Цікавасць выклікаюць падыходы навукоўцаў да вывучэння дадзенай праблемы, а таксама спецыфіка асвятлення пытанняў гісторыі вышэйшай школы рэспублікі.*

Прадстаўлена навуковым кіраўніком кандыдатам гістарычных навук І. У. Цітовічам.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 24.05.2013.

Комплекснае вывучэнне гісторыі вышэйшай школы СССР пачалося ў другой палове XX ст. На працы савецкіх гісторыкаў істотны ўплыў аказала ідэалогія савецкага грамадства. Пры ажыццяўленні даследаванняў навукоўцы павінны былі кіравацца класавым падыходам, прынцыпам партыйнасці. Гісторыя савецкай вышэйшай школы з'яўляецца крыніцай інфармацыі для асэнсавання працэсаў стварэння сістэмы вышэйшай адукацыі ў СССР. Аднак звестак па гісторыі вышэйшай школы БССР у дадзеных даследаваннях вельмі мала.

У 1960–1970-х гг. у працах Я. В. Чуткерашвілі, Ш. Х. Чанбарысава, Н. Л. Сафразьян [1] адлюстроўваўся працэс стварэння «новай» вышэйшай школы, выкрывалася барацьба буржуазных элементаў з прагрэсіўнымі пераменамі, паказвалася роля Камуністычнай партыі ў будаўніцтве савецкай сістэмы вышэйшай адукацыі. Дадзенай праблеме была прысвечана таксама манаграфія В. П. Ялюціна *«Высшая школа общества развитого социализма»,* у якой даследаваліся прынцыпы арганізацыі і структура савецкай сітэмы адукацыі, камуністычнае выхаване студэнтаў, фарміраванне навукова-педагагічных кадраў [2].

Асвятленне старонак гісторыі вышэйшай адукацыі ў БССР пачалося адначасова са стварэннем ВНУ, аднак дадзены працэс першапачаткова насіў статыстычны, даведачны характар. Гэта былі артыкулы ў газетах, часопісах, дзе змяшчалася інфармацыя аб стварэнні ВНУ і іх факультэтаў, колькасці студэнтаў, выкладчыкаў. Звесткі па гісторыі навучальных устаноў таксама прадстаўлены ў справаздачах дзейнасці ВНУ (*«Белорусский государственный университет за 1921–1922 акад. год»*, *«Белорусский государственный университет в 1922–1923 учеб. году»*), выданнях да юбілейных дат (*«Першы выпуск Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту»*, *«Дзесяць гадоў, 1917–1927. Камісія па правядзенню святкавання 10-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларускай дзяржаўнай Акадэміі сельскай гаспадаркі»*) і інш. Дадзеныя публікацыі носяць інфарматыўны характар, з'яўляюцца крыніцай фактычных і статыстычных звестак. Кароткія звесткі пра ВНУ БССР змяшчаюцца ў зборніку *«Наука в БССР за 30 лет»*, які быў выдадзены да 30-годдзя існавання рэспублікі.

Навуковае асэнсаванне працэсу стварэння вышэйшай школы БССР пачалося ў другой палове XX ст. Па дадзенай праблеме былі абаронены кандыдацкія дысертацыі Н. С. Шавельскай *«Борьба Коммунистической партии Советского Союза за развитие высшего образования в Белорусской ССР в годы первой и второй пятилеток»* (1954) па гісторыі і В. М. Хрыпкова *«Развитие высшего технического образования в Белорусской ССР»* (1955) па педагогіцы. У даследаванні Н. С. Шавельскай паказваецца працэс стварэння сістэмы ВНУ пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі,

акцэнтуецца ўвага на ролі вышэйшай школы ў фарміраванні высокакваліфікаваных спецыялістаў для сацыялістычнага будаўніцтва. Кандыдацкая дысертацыя В. М. Хрыпкова ахоплівае даволі працяглы перыяд: сярэдзіну XIX ст. – 1953 г. Навуковец прааналізаваў працэс стварэння вышэйшай тэхнічнай адукацыі ў БССР і выдзеліў у ім асноўныя перыяды, адзначыў прычыны, па якіх развіццё вышэйшай тэхнічнай школы затрымалася да 1930 г.

Гісторыя вышэйшай адукацыі рэспублікі закранагася таксама ў даследаваннях, прысвечаных сістэме народнай адукацыі. У 1950–1960-я гг. былі выдадзены працы І. М. Ільюшына, С. А. Умрэйка *«Народная асвета ў Беларускай ССР»*, І. М. Ільюшына *«Народная асвета ў Беларусі за гады савецкай улады»*, *«Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі»*, у якіх падаюцца кароткія апісальныя звесткі аб сетцы ВНУ ў БССР. Найбольшая ўвага аўтараў звяртаецца на падрыхтоўку педагагічных кадраў [3].

У 1960-я гг. пытанне стварэння вышэйшай школы ў БССР вывучалася П. П. Сіліванчыкам у межах гістарычнага даследавання, прысвечанага ажыццяўленню культурнай рэвалюцыі ў БССР [4]. Асаблівую ўвагу аўтар звяртае на мерапрыемствы КП(б)Б па стварэнні кадраў сацыялістычнай інтэлігенцыі, без якой немагчыма было ажыццявіць культурную рэвалюцыю. Апісваецца барацьба партыі з буржуазнай інтэлігенцыяй, мерапрыемствы па пралетарызацыі ВНУ. П. П. Сіліванчык у сваім даследаванні акцэнтуе ўвагу на барацьбе *«на идеологическом фронте»*, аналізуе дзейнасць партыі ў напрамку камуністычнага выхавання, а таксама змяненне класавага складу студэнтаў.

Цэнтральнае месца ў гістарыяграфіі дадзенай праблемы займае манаграфія М. І. Красоўскага *«Высшая школа Советской Белоруссии»* (1963) [5]. Упершыню аўтарам была зроблена спроба комплекснага вывучэння гісторыі вышэйшай школы БССР. У даследаванні закранаюцца пытанні гісторыі адукацыі на тэрыторыі Беларусі з XVIII ст., аналізуецца працэс узнікнення і развіцця вышэйшай школы да пачатку 1960-х гг. Кола разглядаемых пытанняў ахоплівае стварэнне сістэмы ВНУ, фарміраванне складу выкладчыкаў і студэнтаў, кіраванне, арганізацыю вучэбна-выхаваўчага працэсу, дзейнасць партыйных арганізацый, становішча сістэмы адукацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Многія факты і матэрыялы былі ўпершыню ўведзены ў навуковы зварот. У 1972 г. праца была дапоўнена і перавыдадзена.

Такім чынам, 1960-я гады можна назваць часам, калі пачалося вывучэнне гісторыі вышэйшай школы БССР як асобнай сістэмы, быў апісаны працэс яе стварэння і развіцця ў 1920–1960-х гг.

У 1970–1980-я гг. гісторыя вышэйшай школы асвятляецца ў даследаваннях У. І. Навіцкага, Я. К. Новіка, прысвечаных гісторыі народнай адукацыі. Праца навукоўцаў *«Участие Ленинского Комсомола Белоруссии в борьбе за подъем народного образования»* паказвае ролю Камуністычнай партыі і Ленінскага Камсамола ў стварэнні савецкай сістэмы адукацыі, фарміраванні новай інтэлігенцыі. У даследаванні закранаюцца такія аспекты гісторыі вышэйшай школы БССР, як праца ЛКСМБ па паляпшэнні сацыяльнага складу ВНУ, удасканаленні вучэбнага працэсу, выхаванні студэнцтва [6].

Я. К. Новік у даследаванні *«Формирование кадров народного образования Белоруссии (1917–1941)»* аналізуе сістэму педагагічнай адукацыі і статус навучальных установ у БССР. Навуковец прыходзіць да высновы, што Інстытуты народнай адукацыі і Практычныя інстытуты народнай адукацыі не з'яўляліся вышэйшымі педагагічнымі ўстановамі, і толькі з арганізацыяй педфака БДУ *«осенью 1922 года были заложены прочные основы для развития высшего педагогического образования в республике»* [7, с. 46].

У 1970–1980 гг. у працах Н. І. Лукашкова *«Деятельность Коммунистической партии Белоруссии по подготовке инженерно-технических кадров в годы первой пятилетки (1928–1932 гг.)»*, Н. У. Васілеўскай *«Формирование производственно-технической интеллигенции в БССР (1921–1941 гг.)»*, прысвечаных падрыхтоўцы кадраў інтэлігенцыі ў БССР, разглядаецца развіццё вышэйшай тэхнічнай школы, стварэнне якой адбывалася ў сувязі з правядзеннем палітыкі сацыялістычнай індустрыялізацыі ў БССР, паказаны працэс заснавання вышэйшых тэхнічных навучальных устаноў у БССР, звяртаецца ўвага на сацыяльны склад студэнтаў і іх ідэйна-палітычнае выхаванне [8].

Гістарыяграфія вышэйшай адукацыі БССР савецкага перыяду таксама прадстаўлена даследаваннямі, якія прысвечаны гісторыі асобных ВНУ: Беларускай дзяржаўнай акадэміі сельскай гаспадаркі, Беларускага дзяржаўнага ветэрынарнага інстытута, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і інш. [9]. У іх утрымліваюцца звесткі па гісторыі стварэння ВНУ і іх факультэтаў, складзе студэнтаў і выкладчыкаў, навуковай дзейнасці і інш.

Тэматычна даследаванні па гісторыі вышэйшай школы БССР савецкага перыяду можна падзяліць на працы, прысвечаныя непасрэдна гісторыі вышэйшай школы; прысвечаныя гісторыі народнай адукацыі; па гісторыі асобных ВНУ; якія асвятляюць працэс фарміравання кадраў інтэлігецыі.

Трэба адзначыць, што падыходы навукоўцаў савецкага перыяду адпавядалі ідэалагічным патрабаванням таго часу: даследаванні насычаны цытатамі К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна, каментарыямі прынятых партыйных рашэнняў, маюць арыентацыю

на перавагу класавых інтарэсаў над нацыянальнымі. У іх назіраецца тэндэнцыя да ўніфікацыі гісторыі стварэння сістэмы ВНУ ў БССР. Цяжкасці ў станаўленні вышэйшай школы даследчыкі звязваюць не толькі з матэрыяльнымі праблемамі, але і з *«классово-враждебными элементами»* ў сістэме адукацыі. Шмат увагі надаецца вывучэнню сацыяльнага складу студэнтаў, прагрэсіўнай ролі рабочых факультэтаў, паказваюцца пазітыўныя перамены – павелічэнне сярод навучэнцаў ВНУ выхадцаў з працоўных і сялян. Адлюстраваны таксама праблемы фарміравання прафесарска-выкладчыцкага складу з ліку старой прафесуры і новай пралетарскай інтэлігенцыі. Пільная ўвага надаецца пытанням ідэалагічнай работы партыі ў ВНУ, дзейнасці грамадскіх арганізацый.

Распад СССР, змена падыходаў да вывучэння гісторыі абумовілі наступны этап у даследаванні дадзенай праблемы – сучасная альбо постсавецкая гістарыяграфія гісторыі вышэйшай школы БССР. Выкарыстанне новых архіўных крыніц дазволіла навукоўцам пашырыць кола вывучаемых праблем, пераасэнсаваць працэс стварэння вышэйшай школы БССР.

Ажыўленне нацыянальна-культурнага жыцця пасля абвяшчэння дзяржаўнага суверэнітэту і самастойнасці рэспублікі, пашырэнне беларускай мовы актывізавалі даследаванні, прысвечаныя палітыцы беларусізацыі ў БССР. Дадзеная праблема ў савецкай гістарыяграфіі не асвятлялася, што было звязана са згортваннем палітыкі беларусізацыі ў канцы 1920-х гг., рэпрэсіямі дзеячаў палітыкі, навукі і культуры, імкненнем да ўніфікацыі культурнага жыцця ва ўмовах таталітарнага рэжыму.

Палітыка беларусізацыі ў ВНУ закранаецца ў кандыдацкай працы І. У. Каляды *«Палітыка беларусізацыі ў 1920-я гады: вопыт, праблемы»* (1998), у публікацыях доктара педагагічных навук Е. Г. Андрэевай *«Роднае слова ў аудыторыях. Беларусізацыя 20–30 гг. у ВНУ і тэхнікумах»*, гісторыка А. Ю. Бендзіна *«“Нацыянальнае адраджэнне” ў вышэйшай школе Беларусі (канец 20 – пачатак 30-х гадоў)»* [10]. А. Ю. Бендзін прыходзіць да высновы, што беларусізацыя станавілася часткай палітыкі *«насаджэння»* сацыялізму: *«У атмасферы мэтанакіравана распальваемай класавай варожасці нацыянальнаму фактару адводзілася роля своеасаблівага інтэгратара, здольнага на пэўны час надаць арганічны характар механічна рэгулюемым грамадскім працэсам»* [10, с. 27]. Гісторык прыводзіць факты адміністрацыйнага ціску пры ажыццяўленні палітыкі беларусізацыі ў ВНУ, адзначае, што сапраўднае адраджэнне нацыянальнай свядомасці і нацыянальнай культуры магчыма толькі на аснове захавання правоў чалавека, пры адсутнасці этнакратычнага насілля.

Вывучэнню яўрэйскага элемента ў вышэйшай адукацыі БССР прысвечаны публікацыі Л. Л. Шкуцько, І. П. Герасімавай, М. М. Сакалова [11; 12]. У навуковы зварот былі таксама ўведзены статыстычныя звесткі аб колькасці яўрэяў сярод студэнтаў вышэйшай школы, падаваліся спецыяльнасці, якія карысталіся найбольшым попытам сярод яўрэяў. Вялікая колькасць яўрэяў сярод студэнтаў ВНУ БССР у пачатку 1920-х гг., на думку навукоўцаў, была абумоўлена *«высокім адукацыйным ўзроўнем…, цягай да ведаў, а таксама і псіхалагічнымі фактарамі, сярод якіх не апошняе месца займалі аўтарытэт і павага адукацыі»* [12, с. 22].

Гісторыі навуковай інтэлігенцыі ў БССР прысвечана манаграфія Г. У. Карзенкі *«Подготовка научных кадров в Беларуси. Взгляд сквозь годы»*, у якой асвятляюцца працэс падрыхтоўкі навуковых і навукова-педагагічных кадраў, развіццё аспірантуры, павышэнне кваліфікацыі навукоўцаў [13]. Праблема стварэння ў БССР аспірантуры закранаецца М. К. Сакаловым у працы *«Студенчество высшей школы Беларуси 20-х годов XX века»*. Гісторык адзначае, што *«кампартыя справе арганізацыі аспірантуры надавала палітычную афарбоўку, лічыла аспірантуру адным са сродкаў сацыялістычнага пераўтварэння выкладчыцкага складу і зместу навучання»* [14, с. 3].

Пытанне аб фарміраванні кадраў гуманітарных навук БССР у 1920–1930-я гг. даследаваў І. І. Шаўчук [15]. Навуковец дэтальна вывучыў цэнтры гуманітарных даследаванняў, фарміраванне кадравага патэнцыялу, прафесійную і сацыяльна-дэмаграфічную характарыстыкі навуковых кадраў. У дачыненні да студэнтаў-гуманітарыяў ён адзначаў, што дзяржаўная палітыка ў галіне вышэйшай адукацыі па фарміраванні сацыяльнага і нацыянальнага складу праявілася ў двух кірунках: колькасны рост студэнтаў у ВНУ БССР, а таксама перавага ў гуманітарнай студэнцкай супольнасці рабочых, сялян і іх дзяцей, членаў кампартыі і камсамола, а таксама, нягледзячы на згортванне палітыкі беларусізацыі, прадстаўнікоў карэннага этнасу.

Гісторыі станаўлення і развіцця завочнай вышэйшай педагагічнай адукацыі ў БССР у 1930–1940-я гг. прысвечана кандыдацкая дысертацыя па педагогіцы І. А. Андаралы *«Становление и развитие заочного высшего педагогического образования в Беларуси (30– 40-е годы XX века)»* [16]. Навуковец прааналізаваў эканамічныя і сацыякультурныя перадумовы стварэння сістэмы завочнай вышэйшай педагічнай адукацыі, вызначыў асноўныя этапы, асаблівасці дадзенага працэсу.

Гісторыі студэнцтва вышэйшай школы Беларусі 1920-х гг. прысвечана кандыдацкая дысертацыя М. М. Сакалова *«Студенчество высшей школы Беларуси 20-х годов XX века»* [17]. У працы асвятляюцца фарміраванне сацыяльнага і нацыянальнага складу

студэнцтва, роля рабочых факультэтаў у сістэме вышэйшай адукацыі БССР, разглядающца грамадска-палітычныя арганізацыі студэнцтва, пытанні забеспячэння сацыяльных і культурных патрэб. Акрамя таго, М. М. Сакалоў раскрывае супярэчлівасць партыйна-дзяржаўнай палітыкі ў галіне фарміравання студэнцтва, што праявілася ў адмове ад абвешчаных роўных магчымасцей у атрыманні вышэйшай адукацыі, увядзенні платы за навучанне, «чыстках» складу студэнтаў па сацыяльнай прыналежнасці.

Прыкладам комплекснага аналізу гісторыі вышэйшай школы БССР 1921–1932 гг. стала кандыдацкая дысертацыя М. Л. Еўдакіменкі *«Проблемы становления и развития высшей школы Белоруссии (на материалах государственных и общественно-политических организаций (1921–1932 гг.)»* [18]. У працы аналізуюцца праблемы стварэння ВНУ, паказваюцца вынікі паспешных дзеянняў у дачыненні да вышэйшай школы, інтэлігенцыі, супрацьпастаўленне яе працоўнаму класу, якія вылiліся ў рэпрэсіі, што паслабіла прафесарска-выкладчыцкі склад ВНУ. М. Л. Еўдакіменка звяртае ўвагу на трансфармацыю ідэі даступнасці адукацыі ў права на навучанне ў ВНУ рабочых і сялян.

Гісторыя вышэйшай адукацыі БССР таксама асвятляецца ў выданнях, прысвечаных асобным ВНУ і іх факультэтам. Значная колькасць такіх выданняў публікавалася да юбілейных дат. Вядзецца актыўная работа па вывучэнні гісторыі БДУ, асобных факультэтаў універсітэта. Шмат у гэтым напрамку зроблена А. А. Яноўскім [19].

Гісторыя вышэйшай школы як складовай часткі сістэмы адукацыі таксама закранaлася ў кандыдацкіх дысертацыях І. М. Раманавай *«Фарміраванне савецкай сістэмы адукацыі ў БССР 1921–1930 гг.»*, Н. І. Куракевіч *«Дзяржаўная палітыка ў галіне народнай адукацыі і падрыхтоўка настаўніцкіх кадраў у Беларусі (1921–1930 гг.)»* [20].

Сучасная беларуская гістарыяграфія гісторыі вышэйшай школы БССР 1920–1930-х гг. прадстаўляе адзіны храналагічны перыяд, у якім тэматычна можна вылучыць наступныя напрамкі: вывучэнне асобных аспектаў гісторыі вышэйшай школы, вывучэнне гісторыі адукацыі, гісторыя асобных ВНУ, гісторыя вышэйшай школы, якія ў сваёй большасці супадаюць з напрамкамі даследаванняў у савецкай гістарыяграфіі, аднак кола разглядаемых праблем пашырылася.

Такім чынам, у сучаснай беларускай гістарыяграфіі гісторыі вышэйшай школы БССР 1920–1930-х гг. быў зроблены перагляд падзей, звязаных са стварэннем ВНУ ў БССР. Адмовіўшыся ад ідэалагічных падыходаў, прыярытэту класавых інтарэсаў, беларускія навукоўцы звярнулі ўвагу на нацыянальныя асаблівасці працэсу стварэння вышэйшай школы (палітыку беларусізацыі, яўрэйскую адукацыю і інш.), засяродзілі ўвагу на вывучэнні асобных аспектаў гісторыі вышэйшай школы (студэнцтва, завочную педагагічную адукацыю, стварэнне аспірантуры), ажыццявілі іх дэтальны аналіз. Разам з тым назіраецца недастатковая колькасць прац, у якіх комплексна асветлена гісторыя вышэйшай адукацыі, мала даследаваны перыяд 1930-х гг., таму вывучэнне дадзенай праблемы будзе працягвацца.

**Спіс літаратуры**


1. *Чуткерашвили, Е. В.* Развитие высшего образования в СССР / Е. В. Чуткерашвили. – М.: Высш. шк., 1961. – 240 с.

2. *Чанборисов, Ш. Х.* Формирование советской университетской системы (1917–1938 гг.) / Ш. Х. Чанборисов. – Уфа: Башкир. книж. изд-во, 1973. – 472 с.

3. *Сафразьян, Н. Л.* Борьба КПСС за строительство советской высшей школы (1921 – 1927 гг.) / Н. Л. Сафразьян. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1977. – 158 с.

4. *Елютин, П. В.* Высшая школа общества развитого социализма / П. В. Елютин. – М.: Высш. шк., 1980. – 560 с.

5. *Ільюшын, І. М.* Народная асвета ў Беларускай ССР / І. М. Ільюшын, С. А. Умрэйка. – Мінск: Дзяржвучпедвыд-ва М-ва асветы БССР, 1957. – 358 с.

6. *Умрэйка, С. А.* Народная асвета ў Беларусі за гады савецкай улады / С. А. Умрэйка. – Мінск: Дзяржвыд-ва БССР. Рэд. паліт. літ., 1957. – 48 с.

7. Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі / Навукова-даследчы інстытут педагогікі Міністэрства асветы БССР; рэдкал.: С. А. Умрэйка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Нар. асвета, 1968. – 621 с.

8. *Силиванчик, П. П.* Деятельность Коммунистической партии Белоруссии по осуществлению культурной революции в республике (1919–1937 гг.) / П. П. Силиванчик. – Минск: Изд-во Белгосуниверситета, 1961. – 223 с.

9. *Красовский, Н. И.* Высшая школа Советской Белоруссии (исторический очерк) / Н. И. Красовский. – Минск: Госиздат БССР, 1963. – 255 с.

10. *Новицкий, В. И.* Участие Ленинского комсомола Белоруссии в борьбе за подъем народного образования (1920–июнь 1941 гг.) / В. И. Новицкий, Е. К. Новик. – Минск: Наука и техника, 1979. – 269 с.

11. *Новик, Е. К.* Формирование кадров народного образования Белоруссии (1917–1941) / Е. К. Новик. – Минск: Наука и техника, 1981. – 294 с.

12. *Лукашков, Н. И.* Деятельность Коммунистической партии Белоруссии по подготовке инженерно-технических кадров в годы первой пятилетки (1928–1932 гг.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 08.00.02 / Н. И. Лукашков; Белорус. гос. ун-т им. В. И. Ленина. – Минск, 1972. – 24 с.